Прэм'ер Чыгір зноў пад лупай (стар. 2) *«Крамольная» выстава (стар. 3)*
Справа «Мірона»: капітан міліцыі не прызнаўся (стар. 4)

СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Галоўны рэдактар Ігар Гермянчук
Заснавальнік Павел Жук
Выдавец "Газэта СВАБОДА, Ltd."
Наклад 45.000
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская, 56
Тэл./факс 362441

2 красавіка 1996 г. № 24 Кошт свабодны

Лідэры Народнага Фронта ў цэнтры ўвагі прэсы

Як паведаміла прэс-служба Беларускага Народнага Фронта, Зянон Пазьняк і Сяргей Навумчык з канца мінулага тыдня знаходзяцца ў Кіеве

Яны прыбылі ў сталіцу Украіны з мэтаю паінфармаваць міжнародную супольнасць аб антыдэмакратычных дзеяннях прэзідэнта Лукашэнкі, парушэннях правоў чалавека і ўзмацненні дыктатуры ў Беларусі.

Знаходжанне лідэраў БНФ у Кіеве надзвычай шырока асвятляецца як афіцыйнай, так і незалежнай украінскай прэсай, а таксама СМІ іншых краін.

У прыватнасці, першы канал украінскага тэлебачання тройчы трансляваў інтэрв'ю З.Пазьняка, рускамоўная газета *"Независимость"* адвяла частку першай і ўсю другую паласу інтэрв'ю з Сяргеем Навумчыкам. "Тэрор у Беларусі — папярэджанне Украіне", "Украінцы абароняць дэмакратыю ў Беларусі, як сваю!" — пад такімі загалоўкамі друкуюцца матэрыялы пра падзеі ў Мінску. Прэс-канферэнцыя лідараў БНФ сабрала поўную залу журналістаў ды прадстаўнікоў дыпламатычнага корпусу. Між іншым, падчас яе З.Пазьняк паведаміў, што Лукашэнка можа арганізаваць правакацыі на плошчы Незалежнасці 2 красавіка, каб прымяніць да людзей зброю.

Зянон Пазьняк і Сяргей Навумчык выступілі на мітынгу на Сафійскім майдане, прысвечаным абароне незалежнасці Украіны.

В.С.

2 красавіка: рыхтуюцца абодва бакі

З розных крыніцаў у рэдакцыю СВАБОДЫ паступае інфармацыя, што сёння, 2 красавіка а 17-й гадзіне прыхільнікі суверэнітэту Беларусі маюць намер сабрацца на плошчы Незалежнасці ў Мінску, каб выказаць пратэст палітыцы прэзідэнта Лукашэнкі.

Улады, паводле нашых звестак, рыхтуюцца сустрэць дэманстрантаў трайнымі кардонамі спецназа і ўнутраных войскаў.

У штаб-кватэры БНФ праведзены вобыск

Учора (1 красавіка) у 12:25 у штаб-кватэру БНФ (вул.Варвашэні, 8) заявіліся тры работнікі гарадской пракуратуры Мінска і прад'явілі санкцыю на вобыск

Сакратар Управы БНФ Вячаслаў Сіўчык сказаў карэспандэнту СВАБОДЫ, што следчыя на працягу амаль дзвюх гадзін абшуквалі кожны кут ва ўсіх пакоях. Больш за ўсё іх цікавілі паперы і аргтэхніка. Было сканфіскавана некалькі тысяч ўлётак. Кіраваў аперацыяй старшы следчы пракуратуры Сяргей Новікаў. Ён заявіў прысутным, што падставай для вобыска з'яўляецца "арганізацыя мітынгу 24 сакавіка і заклікі да правядзення акцыі на плошчы Незалежнасці 2 красавіка".

Віктар ВАЛАДАШЧУК

Квасьнеўскі, Лукашэнка і «нормы польскай дэмакратыі»

Польская грамадская думка у значнай ступені адмоўна ўспрыняла сустрэчу Аляксандра Квасьнеўскага і Аляксандра Лукашэнкі, якая адбылася ў Віскулях 30 сакавіка.

Прычына таму — палітычны фон, на якім адбываўся гэты візіт. Па-першае, польская прэса вельмі падрабязна напісала пра маніфестацыю і разгон дэманстрантаў 24 сакавіка ў Мінску, а таксама паведаміла пра заклік беларускай апазіцыі да прэзідэнта Квасьнеўскага, каб ён не прыязджаў у Віскулі. Другі фактар, які паўплываў на адмоўную рэакцыю палякаў — прызначанае на 2 красавіка падпісанне саюзнай дамовы паміж Беларуссю і Расіяй. Аляксандру Квасьнеўскаму нават раілі перанесці сустрэчу з Лукашэнкам на адзін-два тыдні. Дзяржсакратар канцылярыі прэзідэнта Марэк Сівец вымушаны быў тлумачыць, што гэтая сустрэча была загадзя запланаваная і яе нельга звязваць з апошнімі падзеямі. І ўсё ж каб змякчыць адмоўную рэакцыю, польскі бок у апошні момант мусіў змяніць праграму паездкі, і запрасіў на сустрэчу з Квасьнеўскім апанентаў Лукашэнкі — Станіслава Шушкевіча, Генадзя Карпенку, Станіслава Багданкевіча ды інш.

Аляксандр Лукашэнка прымаў свайго "цёзку" ў віскулёўскай рэзідэнцыі і нават паказаў Аляксандру Квасьнеўскаму апошні праект дамовы аб саюзе з Расіяй, які ён падпіша з Ельцыным, і які ў Беларусі ніхто пакуль не бачыў. Гэта было вельмі нечакана. Тым больш, што Лукашэнка пачаў тлумачыць, што захаваецца суверэнітэт і тэрытарыяльная цэласнасць ды іншыя атрыбуты, як ён сказаў, "дзяржаўнай улады". Нечаканым назвалі польскія каментатары Лукашэнкаву заяву, што ён *супраць пашырэння NATO на ўсход, але не супраць далучэння Польшчы да гэтага блоку*. Карацей, разумей, як хочаш.

Падчас сустрэчы Лукашэнка таксама паказаў Квасьнеўскаму карту Польшчы, на якой былі адзначаныя вайсковыя фармаванні, перадыслакаваныя апошнім часам да польска-беларускай мяжы. Аднак польскі бок заявіў, што гэтыя звесткі не адпавядаюць сапраўднасці.

З Шушкевічам, Карпенкам, Багданкевічам, Дабравольскім, Таразевічам, Статкевічам А.Квасьнеўскі сустракаўся на сваёй тэрыторыі — у генеральным консульстве Польшчы ў Брэсце. Станіслаў Шушкевіч, як знаўца польскай мовы, пракаментаваў для варшаўскага тэлебачання візіт А.Квасьнеўскага. Маўляў, *час для яго быў выбраны не самы прыдатны, бо гэта фактычная падтрымка "антыбеларускіх антыдзяржаўных дзеянняў Лукашэнкі"*.

Газета *Rzecz Pospolita* падкрэслівае, што ў размове з Квасьнеўскім беларускія апазіцыйныя палітыкі не вялі сябе шчыра, паколькі на гэтай сустрэчы таксама прысутнічалі людзі прэзідэнта Лукашэнкі (Ю.Малумаў ды кіраўнікі Брэсцкага і Гродзенскага аблвыканкамаў). На гэты факт звяртае ўвагу і *Gazeta Wyborcza* (найбольш уплывовае выданне ў Польшчы), крытыкуючы Квасьнеўскага за падобны "плюралізм". Яна лічыць, што прэзідэнт РП павёў сябе ў гэтым выпадку "ніжэй нормаў польскай дэмакратыі".

А напярэдадні візіта А.Квасьнеўскага ў польскім генеральным консульстве, але ўжо ў Гродне адбылася прэзентацыя ўплывовага варшаўскага тыднёвіка *Polityka*. Яго галоўны рэдактар Ежы Пачынскі паведаміў, што брыгада журналістаў з *Polityki* выехала ў Мінск і тыднёвік у бліжэйшым часе будзе змяшчаць матэрыялы з Беларусі ў кожным нумары. Ім хочацца зразумець, якія ж працэсы адбываюцца сёння ў беларускім грамадстве. Яны бачаць, што гэта пакуль да канца няясна не толькі ім (палякам), але і самім беларусам. Аднак для палякаў важна ведаць, што за дзяржава будзе іхняй суседкай на ўсходзе. Ён таксама сказаў, што палякам, якія заўсёды змагаліся за сваю незалежнасць, незразумелыя абыякавыя адносіны большасці беларусаў да сваёй дзяржавы, мовы, сімвалаў.

У 1993 годзе, калі прэзідэнт Польшчы Лех Валэнса прыязджаў у Беларусь, ён выказваў мару, каб ужо ў бліжэйшыя гады паміж нашымі дзвюма краінамі не было межаў. Пакуль, аднак, калючы дрот ніхто з мяжы прыбіраць не збіраецца. Аднак сімвалічна, што беларускі і польскі прэзідэнты сустрэліся менавіта ў Белавежскай пушчы, якая падзеленая паміж нашымі дзвюма краінамі. Пан Квасьнеўскі нагадаў пры гэтым А.Лукашэнку, што менавіта тут кіраўнікі трох краінаў у снежні 1991 года пагадзіліся на тым, што Савецкі Саюз перастаў існаваць. Аднак Лукашэнка адрэагаваў адмоўна, сказаўшы, што *"за гэтым сталом ужо нічога знішчаць не будуць"*.

Сяргей АСТРАЎЦОЎ

На здымках: прэзідэнцкі мітынг у Мінску. Шэф прэзідэнцкай адміністрацыі аддае ўказанні "ініцыятарам мітынгу". Міліцыя арыштавала шэсць чалавек (на здымку справа — хапаюць студэнта).

Падрабязнасці на стар. 2

Як стаць «вхожим» у высокія кабінеты

28 сакавіка карэспандэнту СВАБОДЫ давялося прысутнічаць на сходзе прадстаўнікоў працоўнага калектыва Мінскага завода шэсцерняў, дзе прымаўся зварот у падтрымку саюза з Расіяй.

Дырэктар завода Дзмітрый Казлоў вельмі проста патлумачыў прысутным неабходнасць прыняцця такога звароту: "калі гэтую заяву мы прымем, то тады я буду "вхож" у кабінеты адміністрацыі прэзідэнта і ўрада, каб выбіць крэдыты на зарплату". Са словаў дырэктара вынікала, што іншай крыніцы атрымання грошай прадпрыемства не мае. Завод мае 94 млрд. рублёў запазычанасці, а склады забітыя гатовай прадукцыяй ажно на 150 млрд. рублёў. Работнікам давялося прыслухацца да словаў дырэктара і прыняць зварот.

Віктар ВАЛАДАШЧУК

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Загад начальства спрацаваў лепш, чым «веление сердца»

Арганізатары мітынгу, які адбыўся ў нядзелю 31 сакавіка каля мінскага Палацу спорта, могуць разлічваць на прэзідэнцкую падзяку. Тое, што «бацька» задумаў, яны выканалі

У падтрымку "саюза з Расіяй" быў прывезены народ з усіх абласцей Беларусі. Адзін з аратараў заявіў, што на мітынг сабралася 100.000 чалавек. Тым часам журналісты ацанілі колькасць у 20-30 тысяч чалавек.

"По велению сердца" сюды прыйшлі хіба што ветэраны ды камуністы. Астатніх жа ўдзельнікаў прывезлі на аўтобусах, раздалі чырвона-зялёныя сцягі і загадзя вызначаныя адказныя сачылі, каб прыхільнікі саюзу з Расіяй не разбегліся па сваіх справах. Адзін з рэпарцёраў не паленаваўся і пайшоў за гатэль "Юбілейны" лічыць аўтобусы. Налічыў сотню "Ікарусаў".

На здымку: лідэры кампартыі Віктар Чыкін і Васіль Новікаў узлезлі аж на "казырок" Палацу спорта, каб з вышыні нарадавацца массавасці мітынгу.

Мітынг праходзіў у лепшых традыцыях савецкага часу. Да мікрафону запрашалі прамоўцаў строга па спісе: ад рабочых, служачых, калгаснікаў, ветэранаў, моладзі і г.д. Вялікая колькасць міліцыянтаў пільна сачыла, каб ніхто і нішто не сапсавала запланаванага сцэнарыю. І можа, усё прайшло б добра, калі б не група студэнтаў, што выставілі свой пікет каля інтэрната БДУ, які знаходзіцца насупраць Палацу спорта. Трымаючы ў руках бел-чырвона-белыя сцягі і скандзіруючы "Жыве Беларусь!", яны прычынілі міліцыі шмат клопату. Шэсць хлопцаў амонаўцы схапілі і на мікрааўтобусе з надпісам "Экалагічная міліцыя" адвезлі ў райаддзел. А потым з'явіўся спецназ і шчыльным ланцугом ачапіў пікет. Мітынг, які працягваўся паўтары гадзіны, завяршыўся прыняццем рэзалюцыі ў падтрымку саюза са "старэйшым братам".

Аднак розгалас у грамадстве атрымаў не сам мітынг, а тое, як яго збіралі. Сотні тысячаў работнікаў дзяржаўных прадпрыемстваў і кантор разнеслі па сваіх сем'ях і сярод шматлікіх знаёмых падрабязнасці пра тое, як у іх на працы начальства прымушае з'явіцца на мітынг. Напярэдадні мітынга (у пятніцу і суботу) у нас у рэдакцыі папросту разрываліся тэлефоны ад званкоў на гэтую тэму. Напрыклад, інжынер з "Інтэграла" Іван Клебановіч расказаў, што ў іх на прадпрыемстве кожны цэх і аддзел павінен выдзеліць па пяць-шэсць чалавек на мітынг. На Мінскім заводзе халадзільнікаў ад кожнага ўчастка патрабавалася па 2-3 чалавекі. Такая "норма" была спушчана і на кожны гастраном. Нам званілі з паліклінік, школаў, дзіцячых садкоў і г.д.

Вядома, прэзідэнцкі мітынг ніяк не мог абысціся без удзелу ягоных землякоў. Шклоўская "вертыкаль" выдзеліла для паездкі на мітынг самы лепшы аўтобус, падрыхтавала 30 сцягоў і некалькі плакатаў, выкананых мастаком раённага дома культуры.

Віктар ВАЛАДАШЧУК

Прэм'ер Чыгір зноў пад лупай

Паводле нашых звестак, кампетэнтныя органы атрымалі з самага верху загад актывізаваць пошук кампрамату на прэм'ер-міністра Міхаіла Чыгіра.

Пад прэм'ера пачалі "капаць" яшчэ мінулай восенню, але потым зверху паступіла каманда прыпыніць пошукі. Аднак "перакур" быў нядоўгі. Цяпер "распрацоўка" Чыгіра ідзе ў некалькіх напрамках: былая банкаўская дзейнасць, сувязі з камерцыйнымі структурамі, загарадны дом, грахі сваякоў і знаёмых. Як сцвярджаюць дасведчаныя крыніцы, такая татальная праверка звычайна папярэднічае адстаўцы кіраўніка, а кампрамат збіраецца дзеля таго, каб адстаўнік не "брыкаўся", як гэта было з Багданкевічам ці з Захаранкам. Наверсе, відаць, зразумелі, што справу "ачышчэння" шэрагаў трэба рабіць чыста, каб не было шуму.

А.Г.

«Перамоўны працэс з МВФ будзе прадоўжаны»

Упэўненасць у тым, што перамоўны працэс з Міжнародным валютным фондам будзе прадоўжаны, выказаў пасля сустрэчы з членамі місіі МВФ, якая завяршыла сваю працу 28 сакавіка, прэм'ер Міхаіл Чыгір. Адначасова ён адзначыў: "Сказаць сёння, што для нас вельмі важная падтрымка Міжнароднага валютнага фонду мы не можам, бо эканамічная сітуацыя ў рэспубліцы болей-меней стабільная". Таму, як заявіў М.Чыгір, сёння кіраўніцтва Беларусі дазваляе сабе "дзейнічаць не ў поўнай адпаведнасці з рэкамендацыямі спецыялістаў гэтай міжнароднай фінансавай арганізацыі".

БелаПАН

Паказчык працы чыноўніка – колькасць палітінфармацый

Па звестках з адміністрацыі, прэзідэнт Беларусі падпісаў чарговы ўказ з "палітінфармацыйнай" серыі.

У ім распісана, колькі разоў за пэўны тэрмін павінен выступаць перад народам кіраўнік таго ці іншага рангу. Напрыклад, згодна з гэтым указам прэм'ер-міністру і кіраўніку адміністрацыі прадпісана не радзей, чым раз на квартал трымаць справаздачу перад народнай аўдыторыяй. Міністрам і кіраўнікам камітэтаў прыйдзецца тлумачыць народу "што і чаму" не менш як раз на два месяцы, іх намеснікам — штомесячна. І гэтак далей.

Палітінфармацыйная сістэма будзе нагадваць савецкую, але ёсць істотнае адрозненне: раней людзям "мазгі прамывалі" толькі сакратары парткомаў, цяпер жа за справу возьмуцца ўсе дзяржаўныя чыноўнікі.

Алесь ПАЎЛОВІЧ

«Трэба пацярпець»

Такі быў лейтматыў сустрэчы з выбаршчыкамі, якую праводзіў у Бабруйску намеснік старшыні Вярхоўнага Савета Юрый Малумаў.

Колькі часу трэба цярпець — Малумаў не сказаў, аднак паведаміў, што "эканоміка развалена". Прычыну гэтага ён бачыць у "разрыве сувязяў", і таму, на ягоную думку, трэба тэрмінова яднацца з Расіяй, у выніку чаго, аказваецца, мы зажывем шчасліва і багата. Ю.Малумаў катэгарычна не пагадзіўся з тым, што ўзровень жыцця насельніцтва за перыяд кіравання А.Лукашэнкі знізіўся амаль на 80%. Былы "пінкертон" МУС назваў гэтыя лічбы "происками сил, потерпевших поражение на выборах".

Н.Б.

Пікетчыкі і ветэраны чакалі палкоўніка дарэмна

У Гродне чакалі прыезду прэзідэнцкага памочніка Сяргея Посахава.

Перад Домам афіцэраў, дзе павінен быў выступіць адстаўны палкоўнік, стаялі пікетчыкі з плакатамі, на якіх "высокага госця" называлі "чорным палкоўнікам", "палітычным трупам". На іншых плакатах было напісана: "Расійскім пагонам — не месца на Беларусі", "Саюз двух жабракоў жыццё не палепшыць" і "Абаронім незалежнасць Беларусі".

На сустрэчу з Посахавым збіраліся якраз члены клубу ветэранаў. Некаторыя з іх даволі агрэсіўна рэагавалі на пікетчыкаў, пагражаючы ім "турмой і расстрэлам". Пікет мусіла сцерагчы ад раз'юшаных пенсіянераў міліцыя.

Таварыш Посахаў дазволіў сабе нядаўна пакрытыкаваць у прэсе камуністычную фракцыю ў парламенце. Гэта выклікала абурэнне ў гродзенскім клубе ветэранаў. Палкоўніка запрасілі на паседжанне нібыта для сустрэчы з ім, а на самой справе чакалі ад яго тлумачэнняў. Посахаў ветэранам не мог адмовіць, і паабяцаў прыехаць, але ў апошні момант узяў ды нібыта захварэў. Ветэраны асабліва не паверылі ў палкоўніцкую хваробу. Засталася толькі надзея спаткаць яго ў Мінску, куды яны сабраліся ехаць на лукашэнкаўскі мітынг. Два ветэраны абмяркоўвалі паміж сабою паездку. Маўляў, можна паехаць у сталіцу, каб зрабіць свае справы ды вярнуцца разам з мітынгоўшчыкамі назад. Усё гэта нічога не будзе каштаваць, паколькі дадуць бясплатныя аўтобусы. А каб з'ездзіць у сталіцу туды і назад рэйсавым аўтобусам трэба, між іншым, заплаціць 172 тыс. рублёў. Карацей, на пенсійныя грошы ў Мінск не надта наездзіш.

Абмеркаваўшы з ветэранамі бягучыя справы кіраўнік клуба Л.Абабкаў прапанаваў у сувязі з надыходам дачнага сезону разыйсціся па дамах і не збірацца да восені. Аднак адзін з клубных "аксакалаў" рашуча асудзіў гэтую прапанову. Ён заклікаў пенсіянераў начысціць свае медалі і ў Дзень перамогі прайсці калонай па горадзе, пусціўшы наперадзе сябе барабаншчыкаў і піянераў у чырвоных гальштуках.

С.А.

1 КРАСАВІКА

«Пастка Прымакова» – першакрасавіцкі жарт

У мінулым нумары СВАБОДА надрукавала "сенсацыю" з варшаўскага тыднёвіка *Nie* аб каварным плане, прапанаваным польскаму боку расійскім міністрам замежных справаў Прымаковым падчас ягонага візіту ў Варшаву. Паводле гэтага плана, напрыклад, горад Гродна з ваколіцамі нібыта павінен быў адыйсці да Польшчы.

Паколькі прапанова Масквы непасрэдна датычыць гродзенскіх жыхароў, мы пацікавіліся ў некаторых з іх думкай наконт такой перспектывы. Патрыёты былі абураныя. Па іх словах, нашай тэрыторыяй ніхто не мае права гандляваць і Гродна павінен застацца беларускім горадам. Іншыя, наадварот, з палёгкай гаварылі, што нарэшце, пасля далучэння горада да Польшчы можна будзе пажыць у нармальнай краіне і, што вельмі істотна, без Лукашэнкі.

Між тым больш дасведчаныя людзі, якія чытаюць польскую прэсу і добра ведаюць, што тыднёвіку *Nie* не заўсёды можна давяраць, бо ён спецыялізуецца на рознага роду палітычных скандалах і містыфікацыях, спакойна ўспрынялі "сенсацыю", зразумеўшы, што гэта ёсць звычайная газетная "качка". Заўтра (у сераду) выйдзе наступны нумар *Nie*, з якога даверлівыя чытачы даведаюцца, што "пастка Прымакова" была жартам з нагоды 1 красавіка. Рэдакцыя СВАБОДЫ вырашыла захаваць "чысціню жанра" і паўтарыць гэты розыгрыш. Паршае, мы сыходзілі з таго, што нашым чытачам будзе цікава даведацца пра польскія жарты, якія датычаць нашай краіны. Па-другое, "сенсацыя" атрымала шырокі рэзананс, паколькі *Nie* з'яўляецца адным з самых тыражных у Польшчы тыднёвікаў, якія пішуць на палітычныя тэмы. І трэцяе, "Пастку Прымакова" мы палічылі ўдалым жартам, які грунтуецца на рэальным палітычным скандале, што ўзнік нядаўна паміж Польшчай з аднаго боку і Расіяй-Беларуссю з другога з-за плана пабудовы транспартнага калідору ад Гродна ў Калінінградскую вобласць праз польскую тэрыторыю.

С.М.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

ЦЭНЗУРА

«Крамольная» выстава

4 красавіка на паседжанні ў Саюзе мастакоў Беларусі будзе вырашаны лёс мастацкай выставы, якая экспануецца ў мінскім Палацы мастацтваў. Уладам не спадабалася "палітычная афарбоўка" некаторых твораў, і яны хочуць зачыніць выставу.

Выставу арганізавала суполка "Пагоня", якая аб'ядноўвае каля 70 прафесійных мастакоў з усіх рэгіёнаў Беларусі. Штогод, пачынаючы з 1991, гэтае аб'яднанне мастакоў ладзіць выставы да свята незалежнасці. Так было і сёлета: 25 сакавіка ў прысутнасці дзеячоў культуры і шматлікай публікі вернісаж быў урачыста адчынены. І тут ва запрацаваў цэнзарскі механізм.



Адміністрацыя прэзідэнта "паставіла на вушы" усё міністэрства культуры, і на наступны дзень (26 сакавіка) у Саюз мастакоў паступіў ліст міністра культуры А.Сасноўскага **(гл.копію)**.

29 сакавіка адбылося паседжанне Рады Саюза мастакоў Беларусі (журналістаў туды не пусцілі). Рада павінна была вырашыць: альбо наогул зачыніць выставу, альбо прыбраць апальныя творы. Аднак для прыняцця рашэння не было патрэбнага кворуму і разгляд пытання перанеслі на 4 красавіка.

Што ж не спадабалася прэзідэнцкай адміністрацыі? Найперш — інсталяцыя (мадэрновае мастацкае збудаванне), створанае групай мастакоў. Гэты антыфашысцкі твор уяўляе сабой шэрабалотнае пудзіла ў металічнай касцы, з чорнымі вусамі, якое трымае гумавую дубінку і бярозавы венік. Чырвона-зялёнай стужкай да фігуры прывязана тэнісная ракетка. На шыі вісіць газетная публікацыя з вядомым выказваннем Лукашэнкі пра Гітлера.

Другі апальны твор — карціна "Зомбі" мастака А.Марачкіна. Цэнзарам не спадабалася тут выкарыстанне чырвонай зоркі і БССРаўскага сцяга.

Прэзідэнцкія цэнзары ўнюхалі крамолу і ў карціне А.Клінава "Беларускі матыў": намалявана чырвонае зарыва над зялёнай травой, а ўверсе лятаюць чорныя вараняты.

Але асноўная "крамола" — інсталяцыя. Рада Саюза мастакоў запатрабавала падпісаць гэты ананімны твор прозвішчам канкрэтнага аўтара. Кіраўнік суполкі "Пагоня" А.Марачкін заявіў журналістам, што ён з'яўляецца толькі аўтарам канцэпцыі, якую ўвасаблялі каля дзесяці мастакоў. Ідэю ж, па словах Марачкіна, падаў сам Лукашэнка.

Старшыня Саюзу мастакоў Беларусі Генадзь Буралкін сказаў пасля паседжання Рады, што "мастакі не хочуць увязвацца ў палітычныя гульні. У нашым статуце запісана права кожнага члена Саюза выстаўляць свае творы без палярэдняй ацэнкі журы. Гэтага мы будзем дабівацца і надалей. Супрацьстаянне ў Саюзе, да якога штурхаюць палітыкі, нікому не прынясе карысці".

Алесь ДАШЧЫНСКІ

МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

220048, г. Мінск, праспект Машэрава, 11
Тэлефон (0172) 23 75 74, 23 71 73
Тэлефакс (0172) 23 68-26

26.03.96 № 15-13/128
на № ___ ад ___

Старшыні Рады Беларускага Саюза мастакоў
Г.В.Буралкіну

Старшыні Мінскага гарвыканкома
У.В.Ярмошыну

Аб наладжванні парадку адкрыцця і правядзення мастацкіх выставак у г.Мінску

Як вядома 25.03.96 у Палацы мастацтваў адбыўся вернісаж мастацкай выстаўкі суполкі "Пагоня". У экспазіцыйнай зале, побач з творамі высокай мастацкай вартасці, дэманструюцца і работы, якія сведчаць аб жаданні арганізатараў выстаўкі справакаваць канфлікт палітычнай афарбоўкі, стварыць супрацьстаянне мастакоў з органамі дзяржаўнага кіравання Рэспублікі. Аналагічную выставачную сітуацыю суполка "Пагоня" дэманструе другі год запар і, на жаль, не атрымоўвае адпаведнай ацэнкі яе дзейнасці з боку кіраўніцтва Саюза мастакоў.

Разам з тым, як сведчыць экспазіцыя, парушаецца Закон Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях", а таксама Статут Беларускага Саюза мастакоў.

Лічым, што дапушчаныя факты зняважы дзяржаўнай сімволікі і іншых прававых актаў неабходна тэрмінова абмеркаваць на Радзе Беларускага Саюза мастакоў.

У мэтах далейшай недапушчальнасці безкантрольнага правядзення выставак у горадзе Мінску, на падставе Закона "Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь" (артыкул 27 "Мастацкія выстаўкі") просім распрацаваць і зацвердзіць парадак правядзення мастацкіх выставак (у тым ліку і на адкрытых пляцоўках).

Міністр А.У.Сасноўскі

АНАЛИЗ

«Нулевой вариант», который может закончиться одним большим нулём

Пропагандистская утка, именуемая "нулевым вариантом", похоже, исчерпала свой ресурс жизнеспособности. Ежедневно появляется информация, свидетельствующая о том, что г-н Лукашенко всего лишь в очередной раз применил свой талант использовать самые ничтожные поводы для воздействия на массовое сознание.

В случае с "нулевым вариантом" президент превзошел даже себя самого: несомненный ущерб экономической и политической самостоятельности вверенной ему страны он преподнес как огромное достижение. Премьер-министр М.Чигирь развеял отчасти прекраснодушные заблуждения многих: выяснилось, что задолженность РБ за энергоносители будет погашаться замороженными некогда советским Внешэкономбанком средствами белорусских же субъектов хозяйствования. Тот факт, что величина этих сумм была вчетверо меньшей, нежели совокупная величина долга, оставлял надежду на определенную выгодность соглашения для нашей страны.

Однако спустя неделю была проведена пресс-конференция, где некоторые детали "нулевого варианта", прежде неизвестные, обнародовал министр финансов Павел Дик. Среди прочего он сообщил, что на всю сумму белорусского долга России будут выпущены два векселя: один — более чем на 400 млн. долларов, второй — не то на 600 млн., не то на 916 млн. долларов. Неопределенность второй суммы объясняется тем, что правительствами согласовывается — учитывать ли пеню? Г-н Дик, осенив уста мефистофельской улыбкой, сообщил, что белорусский КМ склоняется к тому, чтобы выпустить вексель на большую сумму. Это, признаться, удивило: подобное джентльменство уместно на светском рауте, при оплате карточных долгов, но встретить его в правительстве стремительно нищающей страны — несколько неожиданно, не правда ли?

Но двинемся далее: этими долговыми обязательствами Россия будет рассчитываться за вывезенный из Беларуси уран (начинку боеголовок) и исключительно на него.

Все вышеперечисленные обстоятельства свидетельствуют: "нулевой вариант" является не более, чем отсрочкой погашения долга, превращением его в беспроцентный — в обмен на списание России колоссальной (калькуляция, к сожалению, не осуществлена) задолженности. Проблема рекультивации территорий опустевших российс-

На первый взгляд «нулевой вариант» выгоден лишь России. Но кое-что получает и президент Лукашенко

ких баз будет проводиться теперь лишь на средства скудного белорусского бюджета. Должны быть забыты и надежды на компенсацию ущерба, нанесенного Беларуси Чернобыльской аварией.

Даже если пренебречь заявлениями экспертов ТЭКа (топливно-энергетического комплекса) о том, что долг Беларуси несопоставим со стоимостью упомянутого урана (по оценкам — от 2 до 10 млрд. долларов), возникает множество вопросов, из которых один — самый больной: кому выгодно? На первый взгляд, одной лишь России. Лукашенко, казалось бы, совершил несомненную оплошность: теперь держать его на коротком поводке будет не "Газпром", а непосредственно российское политическое руководство, являющееся владельцем долговых обязательств Беларуси. Это обстоятельство, а также подписание "единительных" соглашений лишает, как может показаться, "собирателя славян" всякой возможности политического маневра.

Однако, всё несколько сложнее: пресловутые интеграционные договоры обеспечивают г-ну Лукашенко уверенность в дне завтрашнем — как бы не разворачивались события в подвластной ему стране, а упорство, с каким Ельцин и его сподвижники отвергают возможность создания единого государства, позволяют "белорусскому самодержцу" и далее заниматься политическим прожектерством. Кроме того, он получает карт-бланш на любые действия, обеспечивающие консервацию внутриполитического статус-кво в Беларуси — как от российских властей, так и (авось пригодится) от российского "державно мыслящего" большинства граждан. В канун возможных массовых весенне-летних выступлений либо рабочих, либо оппозиции "первому всенародно избранному" это до крайности необходимо. Через год-полтора белорусская экономика тихо (тишину обеспечит спецназ) скончается, долги за энергоносители, требующие немедленного погашения, снова вырастут до уровня января 1996 г. (за февраль 1996 г. они составили 200 млрд. белорусских рублей — по государственным предприятиям) — именно тогда и произойдет, по прогнозам Александра Григорьевича, "объединение в единое государство с сохранением обеими странами суверенитета".

Подведем итог: есть риск, что ожидания г-на Лукашенко оправдаются. Правда, он совершенно не учитывает факторы внешние по отношению не только к Беларуси, но и к России — интересы западноевропейцев и *NATO* (ведь в торге РФ с северо-атлантическим союзом наша страна непременно будет фигурировать). Александр Григорьевич также переоценивает мощь своего репрессивного аппарата — последние события позволяют усомниться в оправданности его упований. Он, очевидно, не готов и к тому, что забастовочно-митинговое движение может стать не только массовым, но и всеобщим.

Будем, однако, надеяться, что все кончится хорошо.

Роман АЛЕШКЕВИЧ

Белорусские рубли продаются только вместе с Беларусью?

Всю прошедшую неделю котировки доллара США на внебиржевом межбанковском рынке продолжали расти, несмотря на то, что на валютной бирже, которая по-прежнему находится под контролем правительственных чиновников, курс остается неизменным (11.500 за доллар).

Внебиржевой курс к середине прошедшей недели превысил рубеж в 13 тысяч рублей за 1 доллар. А в пятницу, 29 марта, котировки достигали 14 тысяч рублей. Вслед за межбанковским рынком росли курсы и на рынке наличной валюты, вплотную приблизившись к 13-тысячной отметке.

Взаимосвязь между этими рынками объясняется просто — при росте котировок на межбанковском рынке становятся выгодными операции по скупке наличной валюты у населения, где курсы обычно намного ниже. Купленная валюта инкассируется и продается на межбанковском рынке уже намного дороже.

Если ранее рост курса доллара можно было объяснить увеличением количества денег в обращении и соответствующим усилением инфляционных ожиданий, то теперь основная причина — попытки объединения с Россией. Предсказать результат этих интеграционных игр фактически невозможно. Поэтому остается неясной и судьба белорусского рубля (ведь заявления о степени интеграции меняются чуть ли не каждый день). Следовательно существует вероятность того, что в процессе политического и экономического объединения белорусский рубль просто исчезнет. Неясность этого вопроса и сыграла плохую службу нашему рублю.

Здесь уместно будет вспомнить историю двухгодичной давности, когда Кебич "создавал" рублевую зону. Тогда существовало более-менее определенное представление о том, что произойдет с белорусской валютой (ходили слухи, что наши рубли будут меняться на российские в соотношении 1:1), поэтому рост курса доллара замедлился.

Но нынешний скачок доллара объясняется еще и возросшей политической активностью. Усилившееся противостояние между сторонниками независимости и поклонниками братской любви к России вылилось на улицы. Пролилась первая кровь. А что еще может больше укрепить любовь населения к доллару, чем нарастание политической нестабильности.

Лишь для валютных спекулянтов наступило благодатное время. Почву для подобных операций создает нестабильность межбанковского валютного рынка — котировки доллара меняются и довольно ощутимо по несколько раз на день. Играя на них можно и оказаться в убытках. В этой ситуации, как известно, в выигрышном положении находится тот, кто обладает наиболее полной информацией о развитии событий. Не зря некоторые органы исполнительной власти трудно отличить от коммерческих структур.

Алесь САДОВСКИЙ

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Справа «Мірона»: капітан міліцыі не прызнаўся

Лёзненская міліцыя актыўна шукае знакамітага "Мірона", які двойчы вывешваў бел-чырвона-белы сцяг на комін раённага быткамбіната (апошні раз — 15 сакавіка, на Дзень Канстытуцыі).

Пад падазрэнне органаў патрапіў нават былы капітан міліцыі Мікалай Ягорчанка — той самы добраахвотнік, які лётась не забаяўся залезці на 40-метровую трубу, каб зняць сцяг. Тады ён атрымаў падзяку ад начальства, а цяпер, калі звольніўся з міліцыі, яго ж і пачалі падазраваць. На кватэру да Ягорчанкі нядаўна заявіліся міліцыянты, надзелі на свайго былога калегу наручнікі і павезлі ў аддзел, дзе паўтары гадзіны дапытвалі. Мауляў, калі ты не пабаяўся палезці здымаць сцяг, значыць, ты і павесіў. Але, не дабіўшыся "чыстасардэчнага прызнання", капітана адпусцілі.

Наступным, кім занялася міліцыя, стаў Уладзімір Собалеў — шафёр лёзненскай станцыі "хуткай дапамогі". Спачатку да яго ў хату завіталі следчы раённага крымінальнага вышуку І.Фядорчанка, які грунтоўна распытаў і запісаў усе біяграфічныя звесткі сп.Собалева, а таксама дадзеныя пра ягоных родных і сваякоў. На наступны дзень У.Собалева выклікалі ў міліцыю, дзе ўчынілі падрабязны допыт, а потым далі нейкі тэкст і запатрабавалі перапісаць яго ўласнаручна друкаванымі літарамі (як вядома, "Мірон" кожны раз прымацоўваў на трубе побач са сцягам аркуш паперы з пэўным тэкстам, напісаным друкаванымі літарамі). Аднак шафёр "хуткай дапамогі" адмовіўся перапісваць тэксты, заявіўшы міліцыянтам, што ў іх няма ніякай падставы дапытваць яго. Але міліцыя мае жалезны (у прамым сэнсе) аргумент супраць сп.Собалева: на ягонай хаце, аказваецца, вісіць металічны флюгер, пафарбаваны ў бел-чырвонабелы колер.

Уладзімір СУПРУНЁНАК
Валодзя ЯНЧУК

Судзілі па-таварыску

Па звестках, атрыманых у Пракуратуры Беларусі, за мінулы год у краіне было спынена і накіравана ў таварыскія суды 5.600 крымінальных і адміністратыўных справаў.

Прычым часта матэрыялы накіроўваліся для рэагавання ў арганізацыі, якія наогул не існуюць. Сярод тых, каму такім чынам удалося пазбегнуць справядлівага пакарання, 480 чалавек, якія здзейснілі службовыя злачынствы, 16 рабаўнікоў, 15 вымагацеляў і 14 гвалтаўнікоў.

Прывітанне В'етнаму!

25 сакавіка ў Мінску быў арыштаваны грамадзянін В'етнама Л., які падазраецца ў крадзяжы 500 тысяч долараў.

Ён быў у ліку заснавальнікаў аднаго з беларускіх банкаў. Атрымаўшы ў 1995 годзе ў Нацыянальным банку Беларусі крэдыт у суме 500 тысяч долараў, Л. пераверў грошы ў в'етнамскі банк і знік. Да гонару беларускіх дэтэктываў, яны здолелі высачыць і арыштаваць грамадзяніна В'етнама, калі ён тайна прыехаў у Беларусь па камерцыйных справах.

СІМ

Налёт на кватэру чэмпіёнкі

Раніцай 28 сакавіка пяцёра злачынцаў у чорных масках учынілі налёт на кватэру пяціразовай чэмпіёнкі свету па фехтаванні Тацццяны Самусенка, якая жыве ў Мінску ў раёне праспекта Машэрава.

Калі рабаўнікі ўварваліся ў кватэру, былая спартсменка адважылася скокнуць са свайго балкона (другі паверх) на вуліцу. Злачынцы адразу ж уцяклі, а сп-ню Самусенку забрала "хуткая дапамога" з пераломамі абедзвюх ног і пашкоджаным пазваночнікам.

Анатоль МІРСКІ

Бандыты напалі на суддзяў

Гэта здарылася ў Магілёве.

На двух народных суддзяў-жанчын і супрацоўніка крымінальнага вышуку, якія ўвечары разам ішлі з працы дадому, напалі двое злачынцаў. Баронячы жанчын, міліцыянт атрымаў два нажавыя раненні. Праз кароткі час бандытаў удалося затрымаць.

Іван ЗАСАДА

Жахліва...

Сем гадоў пазбаўлення волі за забойства свайго дзіцяці прысудзіў жыхарцы г.Кіраўска (Магілёўская вобл.) раённы суд.

Гэтая 21-гадовая жанчына, нарадзіўшы дзіця, задушыла немаўлятку і кінула ў дрэнажную трубу. Праз два тыдні цела было выпадкова знойдзена мясцовымі жыхарамі. Міліцыі спатрэбілася тры месяцы, каб раскрыць гэтае жудаснае злачынства.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Адмаўляюцца ад дзяцей

На мінулым тыдні ў Магілёве яшчэ каля дзесяці дзетак засталіся без бацькоў.

Бацькі нікуды не зніклі, яны папросту падалі заявы з просьбай пазбавіць іх бацькоўскіх правоў і ўзяць дзяцей на ўтрыманне дзяржавы. На гэты крок, па іх словах, яны вымушаны пайсці з прычыны адсутнасці сродкаў пракармліць дзяцей.

Іван ЗАСАДА

СПОРТ

Будапешт – горад удачы

ГРЭКА-РЫМСКАЯ БАРАЦЬБА

☒ Тыдзень таму мы віншавалі нашых барцоў вольнага стылю з заваёвай сямі алімпійскіх ліцэнзій на чэмпіянаце Еўропы ў Будапешце. Там жа прайшоў еўрапейскі форум барцоў грэкарымлянаў. Тут беларусы дамагліся яшчэ большага: у 10 вагавых катэгорыях яны атрымалі 8 пуцёвак у Атланту. Пасля доўгага перапынку ў нас з'явіўся і чэмпіён Еўропы. Гэты тытул заваяваў 25-гадовы мінскі спартсмен Сяргей Ліштван. У мінулым годзе ён быў бронзавым прызёрам. Блізкі да поспеху быў і Уладзімір Капылаў (другая паўсярэдняя вага). Але ў фінале ён саступіў турку Аўлуку. Аляксандр Сідарэнка заняў 4-е месца сярод спартсменаў сярэдняй вагі. Камандар Маджыдаў, алімпійскі чэмпіён Гульняў у Сеуле, выступаў адразу ў дзвюх ролях — галоўнага трэнера і барца 1-й паўсярэдняй вагі. Барэц Маджыдаў заняў 8-е месца і зможа выступіць на алімпійскім кіліме, а трэнер падрыхтаваў зборную Беларусі, якая заняла 4-е месца ў камандным заліку. Перамаглі ж расіяне, у іх — 4 залатыя медалі, у турэцкіх барцоў — 3.

КУЛЯВАЯ СТРАЛЬБА

☒ Будапешт — шчаслівы горад ля беларускіх спартсменаў. Яшчэ адзін еўрапейскі чэмпіянат — і яшчэ адна перамога. Чэмпіёнка Алімпіяды-88 Ірына Шылава стала лепшай на кантыненце ў стральбе з пнеўматычнай вінтоўкі, а пераможца Гульняў у Барселоне Канстанцін Лукашык выйграў бронзавую медаль у спаборніцтвах стралкоў з пнеўматычнага пісталета.

ШАХМАТЫ

☒ Чэмпіён свету Гары Каспараў пасля 7 тураў стаў лідэрам на буйным шахматным турніры ў Амстэрдаме, набраўшы 5 ачкоў. Прычым у сёмым туры Каспараў нанёс першую паразу у турніры другому расіяніну Уладзіміру Крамніку, які цяпер адстае на адно ачко. Паміж імі — балгарын Тапалаў — 4,5 ачка, у мінчаніна Барыса Гельфанда — 3,5.

ФУТБОЛ

☒ Як вядома, нацыянальная зборная Беларусі прайграла таварыскі матч камандзе Славакіі на яе полі ў Нітры — 0:4. Беларускія футбалісты аказаліся негатовыя да гульні ні фізічна, ні маральна. Востра адчувалася адсутнасць самых вопытных нашых майстраў Андрэя Зыгмантовіча, Аляксандра Мятліцкага, Аляксандра Тайкова. Наступны матч наша зборная правядзе 1 мая з нацыянальнай камандай Польшчы.

☒ Адбыліся таварыскія матчы еўрапейскіх зборных: Польшча—Славакія — 0:0, Ірландыя—Расія — 0:2, Кіпр—Грузія — 0:2, Шатландыя—Аўстралія —1:0, Англія—Балгарыя — 1:0, Паўночная Ірландыя—Нарвегія — 0:2, Аўстрыя—Швейцарыя — 1:0, Германія—Данія — 2:0, Бельгія—Францыя — 0:2, Югаславія—Румынія — 1:0, Партугалія—Грэцыя — 1:0.

Нагадаем, футбалісты Аўстрыі і Шатландыі з'яўляюцца супернікамі зборнай Беларусі у адборачным турніры чэмпіяната свету.

☒ Пяціразовыя чэмпіёны краіны футбалісты мінскага "Дынама" правялі ў Галандыі дабрачынны матч з камандай "Эйндховен", якая выступае ў другой лізе мясцовага чэмпіяната. Мінчане перамаглі — 1:0 (гол — У.Макоўскі). Усе сродкі, выручаныя ад продажу білетаў, пойдуць на развіццё дзіцячага спорта ў блізкіх ад Чарнобыля раёнах. У планах дынамаўцаў яшчэ некалькі падобных матчаў, у тым ліку з вядомымі нямецкімі клубамі "Вэрдэр" (Брэмен) і "Барусія" (Дортмунд).

ХАКЕЙ

☒ Вы ужо ведаеце пра датэрміновую перамогу наваполацкага "Паліміра" ў чэмпіянаце краіны. У апошнім туры вырашалася, хто заваюе срэбныя медалі, а разам з імі і права прадстаўляць краіну ў Кубку федэрацыі. "Цівалі" прымалі "Палімір". Настойлівая барацьба, здавалася, вяла да нічыёй — 3:3. Але тут наваполачане, жадаючы патапіць "Цівалі" і дапамагчы гродзенцам, выпусцілі на лёд шостага палявога іграка, але згубілі шайбу і прапусцілі яе ў свае вароты. Мінчане перамаглі — 4:3 і сталі другімі. У выніку каманды размеркаваліся наступным чынам:

1. *"Палімір"(Наваполацк) — 10 ачкоў*
2. *"Цівалі" (Мінск) — 8*
3. *"Нёман" (Гродна) — 6*
4. *"Белсталь" (Жлобін) — 0*

ШАШКІ

☒ Чэмпіянат краіны, дзе стаклетачнікі разыгрываюць пуцёўку на чэмпіянат свету, выйшаў на фінальную прамую. Спераду шматразовы прызёр першынства свету Аляксандр Балякін — 18 ачкоў з 20 магчымых, Аляксандр Булатаў —17, Яўген Ватуцін — 14.

ГІРАВЫ СПОРТ

☒ Новы рэкорд устанавіў знакаміты беларускі асілак Вячаслаў Харанека. На працягу 5 хвілін ён 55 разоў падняў 48-кілаграмовую гіру. Пры гэтым ён ніводнага разу не апусціў яе на падлогу. Папярэдняе дасягненне Вячаслава — 45 разоў.

ВАЛЕЙБОЛ

☒ Абвастрылася барацьба на чэмпіянаце Беларусі па валейболе сярод мужчынскіх камандаў. Пасля таго, як гродзенскі "Камунальнік" і мінскі СКА абмяняліся ўдарамі — 3:2, 1:3, у турніры лідзіруе СКА — 31 ачко, "Спадарожнік" (Віцебск) — 30, "Камунальнік" — 28. Камандам засталося правесці па тры гульні.

ТЭНІС

☒ Тэнісныя турніры ў Кі-Біскейне (ЗША) закончыліся перамогамі суперзорак. Штэфі Граф прайшла ўсю дыстанцыю не сустрэўшы сур'ёзнага супраціву ад суперніц. У фінале яна перайграла амерыканку Чанду Рубін — 6:3, 6:1. У мужчын барацьба была больш напружанай. У першым жа матчы прайграў лідэр сусветнага рэйтынга Томас Мустэр (Аўстрыя). З чвэрцьфінала пачаліся сустрэчы фаварытаў паміж сабой. Горан Іванішавіч (Харватыя) паслядоўна перамог двух знакамітых амерыканцаў — Майкла Чанга і Піта Сампраса. Аднак трэцяга — Агасі — не ўдалося. Прыз за перамогу — 380.000 долараў уручылі Андрэ Агасі. Сусветны рэйтынг цяпер узначаліў Піт Сампрас.

"ФОРМУЛА 1"

☒ Англічанін Дэйман Хіл выйграў і другі этап чэмпіяната свету ў класе машын "Формула-1". Другім у гонцы, якая праходзіла на трасе "Інтэрлагас" у ваколіцах Сан-Паўлу (Бразілія), стаў пілот "Бенетона" Жан Алезі, трэцім — двухразовы чэмпіён свету Міхаэль Шумахер з "Ферары". Пасля двух этапаў упэўнена лідзіруе Хіл ("Вільямс") — 20 ачкоў. Яго таварыш па камандзе Жак Вільнёў і Жан Алезі маюць па 6 ачкоў.

Сямён ПЛОЦ

Вы любіце СВАБОДУ, маеце вольны час і хочаце зарабіць?

Наша газета можа заключыць з вамі дамову на распаўсюджванне СВАБОДЫ

●Мінск 26-87-99 ●Орша 4-28-57
●Гродна 45-41-83 ●Брэст 26-47-13
●Гомель 55-06-69 ●Магілёў 22-63-19

Клуб беспрацоўных

Першы ў Беларусі клуб беспрацоўных створаны ў Магілёве.

Пакуль у ягоным складзе 15 чалавек. Кіраўніком клуба абралі Сяргея Іванова, нядаўна беспрацоўнага, які быў звольнены з завода за крытыку адміністрацыі, але здолеў праз суд аднавіцца на працы. Аб'яднаўшыся ў клуб, беспрацоўныя спадзяюцца, што ім будзе лягчэй знайсці працу і адстойваць свае правы.

З калясак на катафалкі

Клімавіцкі завод металавырабаў мусіць у хуткім часе поўнасцю перапрафіляваца на вытворчасць катафалкаў, надмагільных крыжоў і агароджаў.

Ранейшая прадукцыя завода — дзіцячыя каляскі — імкліва губляе свайго пакупніка. Прычына не толькі ў тым, што айчынныя каляскі моцна саступаюць замежным вырабам. Галоўным чынам гэта звязана з падзеннем узроўню нараджальнасці. Толькі ў мінулым годзе па вобласці памерла на 41% больш, чым з'явілася на свет. У выніку, калі раней рэчаў для самых маленькіх за год выпускалася да 120 тысяч штук, то цяпер вытворчасць знізілася ў 30 разоў. Натуральна, што існуе і чыста эканамічная прычына крызісу заводскай вытворчасці — рэзкае зніжэнне ўзроўню жыцця і падзенне пакупніцкага попыту. Па словах дырэктара завода А. Дварэцкі, сёння больш выгодна рабіць, напрыклад, ручныя цялежкі і сумкі на калёсах, бо іх патрабуе "камерцыйны" турызм. Здаецца сапраўды, калі знікаюць дзіцячыя каляскі з нашых гарадскіх краявідаў, "усё згніло ў каралеўстве Дацкім".

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Падпісны індэкс 63887 E-mail: edit@svaboda.minsk.by © СВАБОДА Спасылка на газету СВАБОДА абавязковая Наклад 45.000 (1-шы завод – 39.500)
Нумар падпісаны ў друк 01.04.96 (15.00) Надрукавана на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная зорка» (г.Мінск, 1-шы Загарадны завулак, 3) ЛВ № 10 Заказ 229

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010